# ProЧытай, ProДумай, ProПішы

**_Стартаваў II Міжнародны сеткавы праект “ЧытаннеPRoРух: ProЧытай — ProДумай — ProПішы”, арганізатарамі якога выступілі Нацыянальны інстытут адукацыі разам з Інстытутам літаратуразнаўства імя Янкі Купалы Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Саюзам пісьменнікаў Беларусі і Саюзам беларускіх пісьменнікаў, Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі, міжнародным педагагічным клубам, Выдавецкім домам “Звязда” і “Настаўніцкай газетай” пры падтрымцы Беларускай Праваслаўнай Царквы._**

У арыгінальным рускамоўным варыянце назва праекта “ЧтениеPRoДвижение” выглядае, можа быць, і крыху больш арганічна дзякуючы рыфме “чтение — продвижение” і візуальнай пераклічцы “PRодвижение — продвижение”. Але адукаваныя людзі ці, прынамсі, тыя, хто хоча стаць такімі, выдатна разумеюць значэнне інтэрнацыянальнай прыстаўкі pro. Гэта значыць “за нешта, у імя нечага, для нечага, перад нечым”. І, адпаведна, зразумелымі здаюцца асноўныя задачы, якія ставяць арганізатары: стварэнне камунікатыўнага асяроддзя для інтэлектуальнага і духоўна-маральнага развіцця ўдзельнікаў акцыі; стымуляванне цікавасці да творчасці пісьменнікаў сучаснай Беларусі; стварэнне ўмоў для віртуальных зносін і жывога дыялогу розных удзельнікаў літаратурнага працэсу (пісьменнікаў, чытачоў, даследчыкаў, педагогаў-славеснікаў і інш.); азнаямленне з чытацкімі прыхільнасцямі дзяцей і дарослых.

Праект “ЧытаннеPRoРух: ProЧытай — ProДумай — ProПішы” ў выглядзе адмысловай інтэрнэт-пляцоўкі паўстаў на вэб-рэсурсе “КнігаСвет”, які за амаль два гады свайго існавання яскрава засведчыў сваю запатрабаванасць у педагогаў і навучэнцаў. Плануецца, што ў ходзе рэалізацыі тут будуць па чарзе публікавацца не толькі кароткія біяграфічныя звесткі пра сучасных пісьменнікаў Беларусі, якія ўключаюць спасылкі на іх аўтарскія блогі, сайты і інш., але і электронныя версіі твораў, водгукі чытачоў — удзельнікаў праекта на прачытаныя кнігі. Для ўдзелу ў мерапрыемстве запрашаюцца навучэнцы 1—11 класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, іх законныя прадстаўнікі, педагогі, даследчыкі, усе зацікаўленыя ў “ProДвижении” чытання і самой літаратуры. Невыпадкова літары PR у назве праекта прапісаны менавіта як вялікія літары. Праект “ЧытаннеPRoРух: ProЧытай — ProДумай — ProПішы” задумваўся як маштабная PR-акцыя, здольная ахапіць шырокія слаі грамадства.

Удзельнікаў праекта чакаюць два этапы — завочны і вочны.

Завочны этап, які стартаваў 10 чэрвеня і працягнецца па 10 кастрычніка 2018 года, мае на ўвазе азнаямленне з творчасцю пісьменніка/пісьменнікаў, чытанне твора/твораў (на выбар), адказы на пытанні міні-анкеты (апублікавана на “КнігаСвеце”), абмен уражаннямі. Вынікам этапу стане выкананне і прадстаўленне ў аргкамітэт творчага задання па прачытаным творы ў вольным фармаце па выбары ўдзельніка (малюнак або ілюстрацыя, паштоўка, ліст аўтару ці герою твора, водгук, аповед, рэцэнзія, эсэ, замалёўка, крытычны артыкул і інш.).

Вочны этап “ProСЛОВА” будзе праходзіць у фармаце творчай сустрэчы чытачоў з пісьменнікамі Беларусі — аўтарамі твораў, прапанаваных для чытання ў рамках рэалізацыі праекта на Міжнародным чытацкім форуме “КнігаСвет +” (кастрычнік 2018 года). Удзельнікі сустрэчы змогуць абмяняцца чытацкім вопытам, абмеркаваць цікавыя кнігі, пашырыць уяўленні пра сучасную літаратуру Беларусі. Адбудзецца ўрачыстае ўручэнне дыпломаў, сертыфікатаў і памятных прызоў.

УВАГА! У творчых работах (водгуках) неабходна пазначыць свае дакладныя даныя (прозвішча, імя і імя па бацьку, адрас, узрост, тэлефон і электронную пошту). Удзельнікі, якія пададуць недакладную інфармацыю, могуць быць не запрошаны на творчую сустрэчу.

Імёны пераможцаў праекта, а таксама інфармацыю пра месца і час уручэння ўзнагарод можна будзе знайсці на старонках Нацыянальнага адукацыйнага партала (www.adu.by), інтэрнэт-рэсурсаў па суправаджэнні турніраў, алімпіяд і конкурсаў (http://olimp.adu.by) і “КнігаСвет” (http://knigasvet.adu.by), на афіцыйных старонках партала ў сацыяльных сетках Facebook, “УКантакце”.

**Мікола ЧЭМЕР.**
*gilevitch@ng-press.by*